# Сёлета мы сталі бацькамі двойчы

**У нашай адносна маладой сям'і прыжылася добрая традыцыя: кожны год, пачынаючы з першага студзеня, мы з мужам на рознакаляровых паперках і коратка апісваем усе радасці і прыемнасці, якія адбыліся ў нашым жыцці, складваем апісанні ў трохлітровы слоік... А потым, 31 снежня, дастаём з паліцы гэтую, напоўненую пазітывам, скарбонку, па чарзе выцягваем паперку за паперкай, у падрабязнасцях і здымках прыгадваем усё добрае, што адбылося за 365 дзён, смяёмся і шчыра дзякуем чарговаму пражытаму году.**

Так атрымалася, што два апошнія ці не найлепшыя ў нашым жыцці. Толькі ўявіце: летась мы ўпершыню сталі бацькамі (а да таго было дзевяць месяцаў шчаслівага чакання і нараджэнне сына)... А сёлета ўлетку ў нас з'явілася яшчэ і цудоўная дачушка-хрэсніца...

Хлопчыка сваёго мы захацелі назваць Тамашом. Імя гэтае не сказаць каб папулярнае ў сучасным свеце. А таму ніколі не забудзем-ся, як хваляваліся перад паходам у загс. Муж перайма ўся, што сына ў першым яго дакуменце — пасведчанні аб нараджэнні — не захочуць гэтак запісваць, скажуць, што няма такога імя. Каб даказаць, што ёсць, ён нават браў з сабою слоўнік беларускіх асабовых імён...

На шчасце, «дакумент» не спатрэбіўся: сына запісалі так, як мы і хацелі, без ніякіх пярэчанняў.

...А як жа ўсхваляваў, як уразіў нас абрад хрышчэння Івонкі! Яго праводзіў малады прыязны ксёндз у адным з віцебскіх касцёлаў, прычым на чысцюткай беларускай мове і без ніякага афіцыёзу. У нас было адчуванне, што мы прыйшлі не ў храм, а ў дом да сваіх самых родных ці найбліжэйшых сяброў. Ксёндз шмат гаварыў пра важнасць духоўных рэчаў, пра адказную місію хросных бацькоў. І нават пажартаваў (ці суцешыў?), што яны зусім не для таго, каб дарыць сваім хрэснікам дарагія лімузіны...

Да ўсяго і толькі потым мы даведаліся, што абрад хрышчэння праводзіцца ў тым касцёле бясплатна. Сям'я, калі ёсць такая магчымасць, можа проста ахвяраваць нейкую суму на развіццё храма. Як па мне, дык гэта вельмі правільна, бо дастатак у маладых бацькоў з малымі дзецьмі бывае розны.

...Сям'я, у якой выхоўваецца наша хрэсніца, двухмоўная. Старэйшы брацік Івонкі падтрымлівае тату і з нараджэння больш гаворыць па-руску. А вось сама Івона першым словам выдала «дзякуй». І гэта была такая мілата, што цяпер, каб падтрымаць дачушку, Сяргей таксама стараецца гаварыць па-беларуску.

Ва ўсю, без супынку, можна сказаць, размаўляе і наш сынок, праўда, не ўсё пакуль можна разабраць. Найлепш у яго атрымліваецца слова «тата». За дзень я чую яго нашмат часцей, чым інтэрнацыянальнае «мама». І радуюся нават больш за мужа, таму што гэта — па-нашаму, па-беларуску.

**Таццяна Міхейчык, фота аўтара,**
*г. Мінск.*




## «Гэта вам, — сказаў мужчына. — Проста так...»

**...Халодным зімовым вечарам удзвюх з прыяцелькай мы ехалі з работы дамоў. Машына ў мяне старэнькая, капрызная, ёй, здараецца (і найчасцей — у сырое надвор'е) чхаць на мае «каманды» — яна возьме і стане. Можа — пасярод аўтатрасы.**

**Што я тады раблю? Ну вядома ж, выстаўляю адпаведны знак, бяру адвёртку, выходжу, адкрываю капот — пачынаю нешта круціць...**

Той раз гэтую «вытворчасць рамонтных работ» вырашыла перанесці на ўзбочыну: удзвюх з прыяцелькай мы спіхнулі туды машыну, я стала калупацца ў халодным жалезе.

— Дзяўчаткі, вам дапамагчы? — раптам прагучала з джыпа, які спыніўся побач.

Я паціснула плячыма, маўляў, «хваробы» сваёй машыны ведаю, «лячыць» умею... Тады ў чым дапамагчы?

— Ну хіба ліхтарык патрымаць?

Пачуўшы гэта, мужчына засмяяўся, сказаў:

— Першы раз сустракаю жанчын, якія не шукаюць дапамогі — самі разбіраюцца ў тэхніцы.

— Дык жыццё, — кажу, — навучыла. І прывучыла...

Рухавік тым часам і сапраўды завёўся... Я закрыла капот сваёй машыны і ўжо сабралася «даць газу», як раптам пасажырскія дзверцы адчыніліся і ў салоне з'явіўся... букет белых руж.

— Гэта вам, — сказаў мужчына. — Проста так.

...Хвілін з дзесяць я прыходзіла ў сябе: кветкі — а тым больш вось такія — мне дарылі... не ўспомню калі!

Гэта было крута! Гэта ўзняло мне настрой на цэлы вечар і нават потым на цэлы дзень.

Крыўдна толькі, што я нічога не ведаю пра таго мужчыну: не запомніла ні твар яго, ні нумар машыны, але ж раптам ён прачытае гэтыя радкі? Раптам пачуе мой шчыры дзякуй — за адзін з найсвятлейшых момантаў года.

**Святлана Магілеўчык,**
*Бялыніцкі раён.*

## Каб не падвесці дырэктара

**...У апошнія дні 2019-га і сапраўды самы час азірнуцца на пражытае, прыгадаць, чым жа запомніўся прамінулы год.**

З роднымі, дзякаваць богу, усё было ў парадку: муж — пры мне, мы з ім адзначылі ізумруднае вяселле — 55-ю гадавіну сумеснага жыцця, дачка (яна медык па прафесіі) жыве з сям'ёй у Маскве, сын — настаўнік (у нас з ім гэта агульнае) — побач, у нашым райцэнтры.

Але ж пра сябе... З дзяцінства мне хацелася пісаць. У школе гэта былі вершы, сачыненні. Асобныя з іх настаўнікі зачытвалі перад класам, а дырэктар школы Іван Іванавіч Палтарацкі аднойчы нават сказаў, што я яго вельмі расчарую, калі не стану пісьменніцай.

Прызнаюся, мары такія ў мяне былі: пасля школы хацела паступаць на факультэт журналістыкі ці філалагічны, аднак на той час у нашым Віцебскім педагагічным інстытуце былі толькі два факультэты — фізіка-матэматычны і хімік-біялагічны. А паехаць на вучобу ў іншы горад магчымасці ў не было: нас з братам мама гадавала адна (тата загінуў на фронце).

Такім чынам я стала настаўніцай хіміі і біялогіі, з гадамі — нават выдатнікам народнай асветы. А паралельна і амаль заўсёды — нешта пісала: вершы, замалёўкі, розныя артыкулы... Калі ж не стала мамы, з'явілася найвастрэйшая патрэба (ці нават абавязак!) напісаць пра ўсё, што мы — трое дзяцей — перажылі з ёй «пад немцамі» ў гады вайны. Я тады малая была, вельмі шмат чаго не разумела, але ж запомніла, нешта асэнсавала...

Вельмі рада, што дзякуючы найперш пісьменніку Валерыю Гапееву гэтыя ўспаміны выйшлі ў свет асобнай кніжачкай «Дзяцінства ў тумане вайны», што ўрыўкі з яе сёлета друкуюцца ў часопісе «Я на пенсии», і на маё імя прыходзяць вельмі цёплыя шчырыя лісты ад людзей, многія з якіх такія ж пакутнікі — дзеці вайны. А гэта значыць, што памяць пра яе па-ранейшаму і жывая, і вельмі балючая.

На пачатку года ў нашай Падсвільскай бібліятэцы (а напярэдадні ў Варапаеўскай) прайшла прэзентацыя яшчэ адной маёй кніжачкі «Хаджэнне за шчасцем». У яе ўвайшлі апавяданні, замалёўкі з жыцця, гумарэскі, якія друкаваліся ў часопісе «Вожык».

Апошнім часам працую над новай кнігай, якая будзе называцца «А званок працягвае звінець». Такім чынам я і сапраўды «раблюся» пісьменніцай (жарт), бо нельга ж падвесці дырэктара.

...Гэтаму 2019 году я ўдзячна і за новае знаёмства са «Звяздой». Аб тым, што ёсць такая газета, што яна, нягледзячы ні на што, па-ранейшаму не здраджвае роднай мове, я, вядома ж, ведала, многае чытала (помню, колькі захапленне выклікала кніга абразкоў Валянціны Доўнар «Праз каханне»!), але каб супрацоўнічаць...

Сёлета ў рубрыцы «Народ на провадзе!» выйшлі мае праўдзівыя гісторыі «Любачка», «Танцуй... Пакуль не замужам», «...Шакаладны пунш» ды іншыя, спадзяюся, далёка не апошнія, бо падпіску на «Звязду» я ўжо аформіла. Мы з мужам будзем чытаць яе і будзем пісаць. Я вельмі люблю беларускую мову і спадзяюся, што з дапамогай «Звязды» навучых (а гэта, паверце, ніколі не позна) лепш пісаць на ёй, лепш размаўляць. Можа, нават прыгожа, як гэта робіць газета.

...Вось так. Нехта можа падумаць, што ў мяне ў гэтым годзе не было ніякіх праблем і непрыемнасцяў. Былі, на жаль. Але ж пра дрэннае сёння згадваць не хочацца: што перажылі, тое перажылі. Мне спадабаўся звяздоўскі гараскоп на заўтра (а мо, і на цэлы год?): «У аптымістаў усё будзе дрэнна, але яны не заўважаць гэтага. У песімістаў усё будзе добра, але ім усё роўна не спадабаецца».

Я па жыцці аптымістка.

**Зоя Наваенка,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

# «...ДЫК ТРЫМАЙЦЕСЯ СВАІХ І ЖЫВІЦЕ ДОМА!»

**У людзей майго пакалення, народжаных у першай палове альбо сярэдзіне 50-х мінулага стагоддзя, сустрэча новага года, 2020-га, не выклікае такой эйфарыі, як, напрыклад, чаканне 2000-га. Тады мы радаваліся пачатку новага тысячагоддзя. Цяпер жа (і многія, на жаль) — кожнаму пражытаму дню.**

Прычына такіх вось змен у настроі ляжыць на паверхні — з узростам пагаршаецца здароўе, стакроць узрастае каштоўнасць жыцця.

Асабіста я зразумеў яе ў 2013-м, калі даведаўся, што хворы на анкалогію. Думкі з нагоды былі самыя цяжкія, прычым гэта быў не столькі страх, колькі адчуванне тупіку і безвыходнасці. Адразу ж з'явілася жаданне тэрмінова завяршыць свае галоўныя справы: дарабіць, дапісаць, дасказаць... А ўжо затым пачаўся пошук паратунку.

У маёй сітуацыі гэта было хірургічнае ўмяшанне, за якое я вельмі ўдзячны доктару Юрыю Рыгоравічу Цемахову. Ён ратаваў маё цела, а паралельна ж, як той казаў, гарэла душа. Адразу прыгадаліся ўсё, што не так рабіў, не так казаў і разумеў, што вельмі позна пачуў мудрае: «И помнить следует о Боге не только лишь в конце дороги. Страшиться нужно с юных дней грядущей участи своей».

Хоць-нехаць, але мне прыйшлося прызнаць, што жыў не па-боску: лічыў сябе вернікам, аднак веры гэтай не было і на гарчычнае зернетка. Вось чаму зараз галоўны клопат (спадзяюся, не толькі мой і не толькі ў новым годзе) — пра чысціню душы і мацаванне духу, а яны ўжо, дасць бог, больш здаровым і зробяць цела.

...А зараз пра год мінулы. Галоўным *набыткам* свайго 2019-га лічу... iPad. Дзякуючы яму я атрымаў магчымасць слухаць найлепшыя тэатральныя пастаноўкі, гутаркі са знакамітымі людзьмі, прапаведзі рэлігійных дзеячаў і шмат чаго іншага (напрыклад, той згаданы блюз Бентана «А вы памятаеце?»).

*Відовішчам* года лічу другія Еўрапейскія гульні, за якімі меў шчасце назіраць: прыемна ўразіў і сам стадыён, і выступленне некаторых спартсменаў.

Самымі *памятнымі днямі* ў сыходзячым годзе былі дні адпачынку ў санаторыі «Ружанскі». Туды мы паехалі разам з жонкай і атрымалі магчымасць яшчэ раз пераканацца, што Беларусь можа годна арганізоўваць аздараўленне і адпачынак не толькі сваіх грамадзян, але і замежных. А калі б да гэтага ды больш прымальныя цэны... Добра было б. І трэба!

Восень апроч іншага парадавала нас грыбамі, а хор «Жыцень» (кіраўнік — мой зямляк, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Леанід Ваўчок) — вялікім канцэртам у родных Смілавічах. Прызнаюся, што гэткай колькасці цудоўных беларускіх песень я не чуў ніколі, але ж яны, дзякуй богу, ёсць, і ўся зала ад іх была проста ў захапленні!

...Не сказаць, каб вялікая радасць, але ж таксама прыемна, што старэйшы ўнук, якому хутка 20, сёлета атрымаў правы на кіраванне машынай. А гэта значыць, у мяне з'явіліся надзеі, што ён калі-ніколі будзе падвозіць не толькі дзяўчат, але і бабулю з дзядулем.

Не можа не цешыць і тое, што Беларусь па-ранейшаму застаецца незалежнай краінай, што хваляванні, выкліканыя дамовай аб паглыбленай інтэграцыі з Расіяй, засталіся (я спадзяюся) толькі хваляваннямі, бо незалежнасць — гэта скарб, які нельга страціць, інакш нашчадкі проста не зразумеюць нас і ніколі не даруюць.

Тое ж можна сказаць пра яшчэ адзін скарб — родную мову, хоць многія, у тым ліку і чыноўнікі, як не ведалі яе ў першыя гады незалежнасці, так і не ведаюць, што ўскладняе камунікацыю і — як на мой погляд — крыўдзіць сапраўдных шчырых беларусаў.

...Што засмучала ў адыходзячым годзе? На жаль, стала менш на аднаго майго аднакласніка. Яўген Мар'янавіч Адуцкевіч (светлай памяці!) у горадзе Чэрвені стварыў першую гімназію і шмат гадоў узначальваў яе. Цудоўны быў чалавек: муж для жонкі, бацька для дзяцей, дзядуля для ўнукаў і выдатны настаўнік для вучняў.

...Вельмі хацелася б завяршыць гэтыя разважанні пра свой год нейкімі прыгожымі паэтычнымі радкамі аб тым, што не варта перамагаць за розных непрыемнасцяў ды нястачы, бо нехта недурны казаў, што здаровы жабрак шчаслівейшы за хворага караля. Таму галоўнае — паверце — не хварэць. А далей...

*Радасць ходзіць не да ўсіх,*
*Што даўно вядома...*
*Дык трымайцеся сваіх*
*І жывіце дома!*

**Вячаслаў С.,**
*г. Смілавічы.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**